Але каліграфія забыцца пра тое, што было створана, што стала культурна-гістарычнымі фактамі. Аналіз стану нашай культуры пісьма сведчыць пра тое, з якой вялікай цяжкасцю аднаўляецца страчанае, бо, адраджаны разбуранае, можна толькі набліжацца да першапачатковага яго стану.

Для маштабнай культуры важны не толькі ўнікальны талент адной асобы, але і такая патрэбнасць людзей у грамадстве, якая далучана да яе. Гэта фарміруе устойлівае творчае асяроддзе, развівае вобразна-эмацыянальнае мысленне.

Адной з такіх маштабных формаў выяўленчасці з'яўляецца каліграфічнае пісьмо. Заняткі каліграфіяй садзейнічаюць замацаванню ведаў, развіццю ўменняў і навыкаў, патрабуюць стараннасці і стараннасці, даюць магчымасць пераключыць творы праўдзе, удасканальваць індывідуальныя здольнасці, сведама інтэрпрэтаваць узаемадзеянне тэкста і формы. Пры гэтым да прадмета „Каліграфія" можна адносіцца па-рознаму. Для адных – гэта пра-

фесіяй, від мастацкай дзейнасці, для другіх — хобі, трэція праяўляюць зікавасць да каліграфіі як да мастацкай забавы, імкнучыся тэарэтычна зразумець яе сэнс.

І чым больш людзей будзе займацца гэтым відам мастацтва, тым больш знаным будзе ўклад у агульную культуру. Гэта: магчыма з прычыны агульнадаступнасці каліграфіі, бо амаль усе мы валодаем першаснымі навыкамі пісьма, а ўласны почырк неспадзяваны.

На жаль, наша культура пісьма значна знізілася і вербальная мова не падабела гэтага, што, несумненна, адбіваецца на нашай культуры. У Беларусі адраджаецца зікавасць да шрыфтавога мастацтва, ураўстай і мастацкай каліграфіі, вядуцца пошукі і новых выразных сродкаў.

І такія паглыбленае вывучэнне мінулага і аналіз сучасных тэндэнцый развіцця літарнага мастацтва змогуць абудзіць устойлівую патрэбу развіваць і удасканальваць пісьмо, набліжаць нас, калі у Беларусі будуць свае друкарскія гарнітуры, будзе выдадзена кніга па гісторыі беларускага пісьменства, праведзены навукова-мастацкі аналіз шрыфту і шматлікіх ініцыялаў Ф.Скарыны, дзе адлюстравана боская і зямная мудрасць таго часу.

Роля мастака-каліграфа вызначаецца яго садзейні-

ганнем развіцця гравюрнага мастацтва. І буду шчаслівы, калі мая праца хоць трошкі закране твае пачуцці, думкі, а твой розум спасцігне штосьці новае, бо мастацтва гэсьма-неадъемная частка нашай культуры Удзячны А. Капру з Ляйпцыга, В. Тоатсу з Таліна, А. Гурскасу з Вільні і іншым, якія натхнілі мяне на творчасць, якая не прыносіць гучнай славы і вялікіх матэрыяльных выгадаў, але для людзей значная.

З гісторыі каліграфіі

Каліграфія (грэч. kalligraphia – прыгожы почырк, ад kallos – прыгожасць і graphо – пішу) – мастацтва прыгожага і выразнага пісьма (вытворныя ад слова „каліграфія" – каліграф, каліграма, каліграфічны этюд, каліграфічны малюнак і інш.).

Ва ўсе часы ў розных дзяржавах каліграфія развівалася і шанавалася па-рознаму, што абумоўлена гістарычнымі, тэрытарыяльнымі, палітычнымі і некаторымі іншымі асаблівасцямі. Напрыклад, у дзяржавах з ісламскай рэлігіяй каліграфія – аснову яе мастацтва, у Японіі і Кітаі – традыцыйна значная частка агульнай культуры. У Еўропе мастацтву пісьма таксама надавалі важнае значэнне, але не заўсёды ўдавалася захаваць яго высокі ўзровень.

Агульнай заканамернасцю для усходніх славян з'яўляецца карыстанне каліграфіяй на аснове ўстава, паўустава, скорапісу; а пасля рэформы 1709 года – рускай-грамадзянскага

шрыфту.

Устаў – пісьмо на канонах; на ўзор вертыкальнае, павольнае пры напісанні, тып помыку старажытных славянскіх рукапісаў, напісаных кірыліцай з выразным абрысам кожнай літары.

У Беларусі кірылаўскае каліграфічнае пісьмо бярэ пачатак ад напісання багаслужэбных кніг (канец X – пачатак XI ст.). Захаваныя лепшыя ўзоры старабеларускага кніжнага мастацтва з устаўнай каліграфіяй (Тураўскае Евангелле, XI ст.; Псалтыр, 1261 г.; Мсціжскае Евангелле, XV ст.; Віцебскае Евангелле, XVI ст. і інш.) адрозніваюцца некаторымі павелічэннем памеру літараў у тэксце, больш светлай графікай, павялічанай міжрадковай і міжлітарнай прасторай строіні падпарадкаваннем літараў вертыкалі, захаваннем рытму, разрастанню арнаментных матываў.

Вязь – вяршыня мастацка-дэкаратыўнага ўстава, па складанасці графікі займае сярэдняе становішча паміж арнаментам і літарным тэкстам: рыхлы складаны з пераважай вертыкальных застак, літары розныя маштабам ці нават прапушчаны. Вязью выконвалі загалоўкі, назвы кніг, ініцыялы, надпісы ў інтэр'еры і экстэр'еры узорваў...

Паўустаў – адна з графічных разнавіднасцяў пісьма

у славянскіх рукапісах, якая ўзнікла як спрошчаная форма ўстава і давала большую хуткасць напісання. У Беларусі ўжываўся з XIV ст.

Каліграфія на аснове паўустава захоўвае некаторыя асаблівасці, уласцівыя уставу, але графіка літараў больш дробная, з невялікім выгінам і нахілам на вертыкалі, з відавочным падаўжэннем за лінію ніжняга радка літараў Д, З, Р, У і вялікай колькасцю надрадковых знакаў (зітлаў, крыдыханняў, націскаў у выглядзе кропак, рысачак), запазычаных з паўднёваславянскай арфаграфіі.

Скоропіс – нахільны, хуткі, справавы від пісьма з любой на вымушанымі індывідуальнымі асаблівасцямі выканаўцы. Большасць падоўжаных літараў з нахілам у правы бок, назіраецца разнастайнасць, імкненне да неперарыўнага напісання слоў. Старабеларускі скоропіс і каліграфія на яго аснове некалькі адрозніваюцца ад аналагічнай формы пісьма Маскоўскай Русі.

Уплыў заходнееўрапейскай культуры ў Беларусі адчуваецца і на графіцы пісьма. У XV – XVI ст. ст. на беларускі скоропіс і каліграфію зрабіла прыкметны уплыў паслягатычнае пісьмо, бастарда. Каліграфія гэтага перыяду вылучаецца роўнымі, вертыкальнымі курсівамі, які лёгка чытаюцца, расцягнутымі

на гарызанталі, з умераным прымяненнем росьпіскаў. Для позняй каліграфіі характэрна больш прыкметная акругленасць, падоўжанасць надрадковых і падрадковых элементаў літараў, шырокі размах пісьма, што сведчыць пра ўплыў рускага скорапісу.

Шматлікія захаваныя творы каліграфічнага мастацтва сведчаць пра тое, што дайшоў да нятага віду мастацтва адносілася з большай павагай, і майстры каліграфіі вартыя таго, каб іх захавалі іхныя імёны. Лазар Богша — адзін з першых старабеларускіх майстроў, які зрабіў надпіс на крыжы Ефрасінні Полацкай; у Смаленскім псалтыры (1395 г.) пакінуў упамін пра сябе перапісчык Лука Смалянін; увекавечылі свае імёны Самуйла Пяляхоўскі ў Супрасльскім рукапісах (XVI ст.), Якімец з Навагрудка (1512 г.), Апанас Свіязэўскі (XVII ст.), Антон Кіеўскі (XVII ст.) і іншыя.

У сувязі з пашырэннем у XIX ст. у Заходняй Еўропе так званай англійскай каліграфіі (пісьмо нахільнае, суцэльнае, літары злучаны, выкананы з нажыскам вастраканцовым металічным пяром) беларускае пісьменства зазнала яшчэ адзін уплыў. Пазней шырокае выкарыстанне машынапісу не садзейнічала развіццю каліграфіі і стала прычынай скасавання такой прадмеціі, як пісар. У наш час паўсюднае ўжыванне шарыкавых ручак

прывяло да аднастайнага і сумнага пісьма. У выніку каліграфічнае пісьмо амаль забытым.

Каб выправіць такі стан, неабходна пачынаць са школы. З першага па сёмы клас трэба вучыць дзяцей пісаць востраканцовым пяром англійскай каліграфіі, з восьмага і далей асвойваць стылістыку, а індывідуальны скорапісны почырк сфарміруецца сам па сабе. Гэта дазволіць закласці аснову пажыццёвага разумення сродкаў пісьма, уменне пісаць прыгожа, звыклая або кароткапісьмо. А маючая каліграфія павінна стаць лёсам тых, хто імкнецца сваім талентам ствараць знаёмае і вечнае.


Каліграфічнае мастацтва на кампазіцыйна-выразных сродках супадае музыкі, харэаграфіі, архітэктуры. Гэта знайшло адбітак у такіх выразах, як „мелодыя каліграфа", „танец пяра", „барочная лінія".

Каліграфія прадугледжвае глыбокае разуменне тэмы, ведання законаў і катэгорый графічных формаў, высокае майстэрства выкананых ліній, выяўленне аўтарскай індывідуальнасці, у якой нацыянальны свет выказваецца мовай лінейных формаў, узбагачэнне эмацыянальнага вопыту мастака.

Мастацтвам каліграфіі можа авалодаць кожны чалавек, які схільны да творчай мастацкай дзейнасці, ведае правілы граматыкі, дасканала валодае тэхнікай напісання, малявання

ня і дакладнай пабудовы літараў, здольны працаваць час знаходзіцца ў спакойным стане, сістэматычна выконваць практыкаванні для рукі з інструментам пісьма.

Толькі моцнай і пластычна развітай рукой з тонкай тактыльнай адчувальнасцю пальцаў і добра наладжаным інструментам можна ўтрымана і лёгка ажыццявіць маштабную ідэю. Майстар пяра павінен імкнуцца да такой унутранай раўнавагі, калі ўзаемны вобраз і ўвесь наступны творны працэс у поўнай адпаведнасці суадносяцца як цэлае, а напісаныя дэталі выкананы лёгка, упэўнена, без карэктыроўкі і ўдакладнення элементаў.



3445
г. Ижевск

Лінія

— асноўваны графічны след на плоскасці.

У кожным руху пяра мы імкнемся зразумець заканамернасць і асаблівасць яго. Выкананне самай простай умовы пры розных магчымасцях пашырэння думку, што дакладных паўтораў няма, як няма і абсалютна аднолькавых поваркаў. Адны каліграфы імкнуцца да вертыкалі, іншыя — да дыяганалі або гарызанталі, выяўляючы свой стан праз прамую ці выгнутую лінію. Усё гэта вызначае форму лініі, яе імкненне да свабоднага і дакладнага руху, да майстэрства.

Уявіце, што перад вамі ліст белай паперы. Для творчага чалавека гэта выяўленая прастора. Усё схіляе да сканцэнтравання, а вочы шукаюць кропку апоры, даследуюць контур, вызначаюць цэнтр, восі. Але вось пяро дакранулася да паперы і лінія моцна падоўжылася, змяніла траекторыю, амплітуду руху і, плаўна згінаючыся, мяняючы таўшчыню, закончылася кропкай.

Праведзеная на лісце паперы лінія з'яўляецца нібы аўтографам, выяўленнем нейкіх якасцей выканаўцы, яго нага вобраз-

нага мыслення. Вось яна напружылася, як зялёва лука, потым
змянілася ў прасторы, разгарнулася, загула, а вось ужо як пер-
шая баразна ў густым раннім калі – дойлая, кляродная, фак-
турная. Нялма тут выпадковага: Тое, што прыцягвае ўвагу,
або адназначна прымаецца ўсімі, або кожным інтэрпрэтуецца па-
свойму. Так непрыкметна мы прыйшлі да таго, што лінія
стала выконваць функцыю знака. Простая вертыкальная адпа-
вядае норме, нахілёная ўправа – руху ўверх, нахілёная ўлева
– руху ўніз, спіральная – кандэнсатар энергіі і г.д.

Выключную мастацкую значнасць у каліграфіі маюць непера-
рыўнасць руху, натхненне і майстэрства жывога слядў, які на-
зываецца росыпрам. Гэта – лінія, што выяўляе накіраванасць
думкі, індывідуальны эмацыянальны стан, уменне калі –
графа графічна выказаць рух ва ўсіх яго фазах. Строгая
рытмічная змена ліній і найтанчэйшыя графічныя нюансы не-
дасягальныя для падробкі. Эмацыянальна-экспрэсіўны рух мо-
жа выяўляцца ў форме вальнай моднай лініі, рытмічнай уладка-
ванасці і асацыятыўнай вобразнасці. Тут часам простае ста-
новіцца бясконца складаным, а складанае простым, не ўсё
тут даступна дакладнаму выкладанню. Каб зразумець гэта,
неабходна ўбачыць тое, што даступна толькі вам.

Ілюстрацыі

Інструмент каліграфа 21
Форма лініі падуладна хуткасці руху інструмента 22
Сімвалічнае значэнне лініі 25
Геаметрычная сетка 24
Рознанакірункавыя прамалінейныя рухі 25
Фактура 26
Фактурны след 27
Натхнённыя штрыхі 28
Крывалінейны рух 29
Спроба пяра 30
Росшырк 31
След пэндзля 32
Экспрэсія 33
Кампазіцыя 34
Аўтограф-экспрэсія 35
Рухі, падобныя да „S" 36
Ад простага да складанага 37
Натхненне 38
Літарны матыў 39
Рэха 40,41
Рэзананс 42
Акорд 43

Літара

— графічны знак алфавіта, які абазначае выразны элемент вуснага маўлення, які мае формы вялікую і малую, рукапісную або друкаваную, функцыянальную або мастацка-дэкаратыўную.

Кожны пісьмовы знак алфавіта, якім мы карыстаемся, некалі абазначаў канкрэтны прадмет, і гэтаму была падпарадкавана яго форма. Так, літара А бярэ свой пачатак ад вызавы галавы быка, ад слова „алеф", а літара Ш абазначала тры калосы, П — тупік і гэтак далей. Было б карысна вывучаць у школе не толькі цікавое значэнне літараў, але і паходжанне формы знака. Гэта цікава і важна для разумення першапачатковага значэння літарнай формы, у тым ліку старажытнай славянскай азбукі, каб умець чытаць першакрыніцы і ведаць сімволіку.

Так, у старажытнаславянскай мове літарныя сімвалы быццам хавалі ў сабе крадзькнавэнне свету, а неба над галавою — было непазнанай тайнай. У кірылаўскім уставе літара „аз" абазначала ўсяму свету сонечнае святло, пачатак усіх

пачаткаў, а „буки" — другую літару азбукі.

Сучасная форма літараў прама не залежыць ад абазначанага гука і адрэзка і тая ж знак можа мець розныя значэнні (напрыклад, В у лацінскай і беларускай мовах, а літара А ўяўляе фанему, лік, таварны знак і інш.).

Варыянтнасць формаў знакаў абумоўлена ў асноўным законамі зрокавага ўспрымання, якія вызначаюць распазнавальнасць іх пры чытанні і ўзнаўленні. З улікам гэтага, літара мае дзве графемы, два базісы. У першым выпадку — гэта асноўная адметная адзнака, па якой адрэзак знак адрозніваецца ад аднаго (напрыклад, літары А і Ж маюць адналькавую колькасць элементаў, але розны іх прасторавы стан, што і вызначае іх адрозненне).

Для правільнага напісання літары неабходна ведаць паслядоўнасць яе выканання, пачатак, напрамак і заканчэнне руху, форму і прынцып сувязі элементаў. З гэтага пачынаецца ўразуменне асноў каліграфіі, а інструмент, прыёмы работы, тэмп напісання, амплітуда руху, кампазіцыйныя сродкі дазваляюць максімальна ўлічваць мастацкую выразнасць, ўзаемадзеянні крыніцай бясконцай разнастайнасці і дасканаласці формаў.

Адрозніваюцца візуальнай сімвалічнай вобразнасцю, літара

можа мець і больш шырокае значэнне, быць мастацка-дэкаратыўным творам, ініцыялам (лац. initialis – пачатковы, у старажытнаславянскай мове – буквіца). Ініцыял мае складаную вобразна-графічную кампазіцыю з прымяненнем арнаменту, ілюстрацыйнага малюнка і іншых сродкаў. Звычайна вылучаюцца павялічаным памерам у пачатку тэксту. Старажытныя славянскія майстры каліграфіі выконвалі буквіцу асабліва старанна. У кнігах Ф.Скарыны пачатковыя літары падпарадкоўвалі зместу тэксту ў спалучэнні з народнай мудрасцю.


Шырока пашырана выкананне літарных знакаў у выглядзе манаграмаў (грэч. monos – адзін, gramma – літара), мастацкая графіка якіх будуецца на прынцыпе каўтораў, накладанняў, сумяшчэнняў адной ці некалькіх літараў з прымяненнем росьыркаў. Сюды адносіцца і віртуозна напісаная літара, якая выяўляе, напрыклад, „скрыпічную малодыю", „таньцу кшталя" і іншыя матывы.

Форма літары можа выкарыстоўваць розныя фактуры. Шматразовае каўтарэнне яе рознымі або іншымі спосабамі па розных праграме дазваляе стварыць арыгінальную сучасную графіку.

Каб глыбей спазнаць мастацтва каліграфіі, трэба ведаць законы выяўленчай і выразнай графікі, вобразна-сімвалічна думаць, валодаць рознымі спосабамі выканання літарных формаў.

Ілюстрацыі


Пабатак 48
Каліграфічная графіка 49
Малодыя 50
Гуральная літара 51
Знак для дзіцячага танцавальнага калектыву 52
Рэквіем 53
Дэкаратыўная літара Ж 54
Літара а – фактура 55
Кампазіцыя з дзвюх літар 56, 57
Знакі, два пабаткі 58
Літара д – выражэнне краявід 59
Варыянты манаграм 60
Манаграма аўтара 61
Буквіца „глагаль" 62
Фантазія 63
Буквіца А на латывах Ф. Скарыны 64
Манаграма, прысвечаная пэту 65
Жыта і васілёк 66
Літара і – пабатак 67
Прэзент 68
Аб'ёмны знак 69
Кампазіцыя, калаж 70
Праектная графіка 71































Глава I.

Бићеш свога
бића учитељ.

Для старешинства
руског далековид сам
форма штари хвала.
у свом наслонах гувернер.

Све мудро и разумно
Ја не, не дајем до-
бијена правитељу.



Шрыфт

(нямецк. Schrift – пісьмо) – сістэма літараў, лігбаў, спецыяльных знакаў, фарміраванне якіх абумоўлена функцыянальнай, мастацкай – дэкаратыўнай або тэхнічнай мэтазгоднасцю. Ва ўсходніх славян слова „шрыфт" стала выкарыстоўвацца з XVIII ст., да гэтага друкарскія і рукапісныя алфавіты называліся „абуцкай".

Вядома, што любую колькасць знакаў лягчэй запамніць, калі вылучыць тое, што іх аб'ядноўвае, і размясціць у пэўнай паслядоўнасці. На гэтым прынцыпе ўпарадкаваны літары алфавіту, пад вуды-тыпаў; так традыцыйна падаюцца і знакі шрыфту як графічная разнавіднасць пэўнага алфавіта і як від каліграфіі.

Усе наяўныя шрыфты можна падзяліць на групы: 1) камплект знакаў для ўзнаўлення напісаннем, малюваннем, накладнай пабудовай; 2) літарныя і іншыя знакі, прызначаныя для тыражавання друкарскім спосабам (у палі-графічнай вытворчасці больш пашырана назва „гар-

нітура"); 3) прымяненне пісьмовых алфавітаў як сродку палі-
графічнай або напісанай мастацкай – дэкаратыўнай кампазіцыі.

Вырашаюць творчую задачу, накіраваную на удасканален-
не традыцыйных шрыфтоў або распрацоўку новых варыянтаў,
мастак павінен выразна ўявіць наступнае: а) параметры
прасторавых характарыстык знакаў адносна вертыкалі і га-
рызанталі, шчыльнасці, насычанасці; б) набор формаў элемен-
таў і прынцып іх узаемадзеяння, структурнае або пластыч-
нае; в) тып літараў – друкаваныя або скарапісныя, на асно-
ве якіх будзе будавацца працэс формаўтварэння.

Істотны ўплыў на дасягненне максімальнага адзінства
элементаў шрыфту маюць арганізацыя самога працэсу, прак-
тычны вопыт выканаўцы, тэхнічныя сродкі, што прымяняюц-
ца ў працы. Усё гэта павінна быць накіравана на дасягнен-
не высокага ўзроўню графічнай культуры, улічваюць самыя
найтанчэйшыя нюансы. Кожны знак павінен быць выверан
геаметрыяй і пабудовай.

Але мастацкая знаёмасць літараў або іншых знакаў (лі-
баў, знакаў прыпынку) залежыць не толькі ад іх законамернасці
і дасканаласці, але і ад узаемадзеяння з іншымі знакамі, ад
кампазіцыйнага прыёму арганізацыі. У мастацкай практыцы
каліграфаў пашыраны накірунак, калі шрыфтавыя алфавіты

выкарыстоўваюць як сродак для выразнасці такіх кампазіцыйных катэгорый, як сіметрыя, кантраст, рытм, для утварэння розных фактураў.

Графіка шрыфту можа выклікаць такія выразныя, як урачысты, строгі, маладзёны і іншыя. У любым выпадку важна захоўваць не толькі правільнасць напісання формы літараў, але і кампазіцыйную пабудову. Трохі нязвыкла бачыць літары, якія вольна ляжаць, нібы гароды ў туманах, але мастацкая фантазія каліграфа бязмежная. Асабліва тады, калі каліграф выкарыстоўвае для гэтага графабудаўнічую тэхніку, што дазваляе дасягнуць новых далягляданў у шрыфтавым мастацтве.

У якімі б правіламі ні быў замацаваны парадак пісьмовых знакаў алфавіта, законы развіцця шрыфту выяўляюцца маўней, і праўзе гэты бясконцы.

Ілюстрацыі

Алфавіт, аўтарская інтэрпрэтацыя на матывах Супрасльскага рукапісу X-XI ст. ст. 76

Алфавіт на матывах літар са Статута Вялікага княства Літоўскага, 1529 г. 77

Графіка літар на аснове старабеларускай граматы 1546 г. 78

Хуткі тып пісьма 79

Старажытнаславянскія назвы літар 80

Вертыкаль 81

Малыя лінгары 82

Вялікія літары з засечкамі 83

Малыя літары (шкальны варыянт) 84

Вялікія літары (шкальны варыянт) 85

Алфавіт на аснове натуральных, паскораных рухаў 86

Эмацыянальнае напісанне літар 87

Стэнаграфічны каламбур 88

Алфавіт стэнаграфіі 89

Шрыфт шырокаканцовыя пяры 90

Экспрэсіўны алфавіт 91

Алфавіт, напісаны вострыканцовымі пэндзлямі 92

Кампазіцыя 93

Контурны, фактурны 94

Танец пэндзля 95

Вобразная кампазіцыя „Птушкі ляцяць" 96

Кампазіцыя з адной літар 97

Зімовае акно 98

Рэльеф на шкле 99

Дрэва 100

Манатыпія 101

Архаічны алфавіт 102


Зімовая дарога 103


Сучасны шрыфт 104

Трагічны 105

Новаскарынінскі шрыфт (2 варыянты) 106, 107


АБВГДЕЁ
ЖЗІЇЙКЛ
МНОПРС
ТУЎФХЦ
ЧШЫЭЯ



АБВГДЕЁЖЗ
ИЙКЛМНОП
РСТУФХЦЧ
ШЩЪЫЬЭЮЯ










АБВГД
ЕЖЗИК
ЛМНОП
РСТУФ-
ХЦЧШ
ЪЫЭЮЯ



АБВГД
ЕЖЗІЙК
ЛМНОП
РСТУФ
ХЦЧШЬ
ЫЭЮЯС








А Б В Г Д
Е Ж З И К
Л М Н О П
Р С Т У Ф
Х Ц Ч Ш Щ
Ы Э Ю Я



Слова

– гукавая ці графічная адзінка маўлення, якая служыць для выказвання нейкага паняцця.

Для нас стала звыкай бачыць тое самае слова надрукаваным або напісаным рознымі формамі літараў і шрыфтоў, што сведчыць пра адносную незалежнасць яго зместу. Знаёмць, сцвярджаць „што важнейшае для каліграфа – змест ці форма", не мае сэнсу. Гэта дае магчымасць самому каліграфу вызначыць першаснасць аднаго з двух знаёмых або згарманізаваць іх узаемаўплыў залежна ад творчай мэты.

Эмацыянальнае ўздзеянне каліграфіі слова дасягаецца максімальнай выразнасцю арфаграфічных спалучэнняў. Мастацкія якасці тут залежаць ад ступені раскрыцця пластычнай выразнасці самых літараў і іх узаемадзеяння, выбару формы літараў, размяшчэння іх у прасторы, арфаграфічных правілаў, стылю пісьма. Захоўваючы граматычную і кампазіцыйную правільнасць слова, каліграф імкнецца

выказаць свае адносіны, адлюстраваць дух часу, пад падобную пастораў або „слепога" капіравання. Ямала цікавага і захапляльнага для творчай думкі ёсць у артыкуляцыі слова, у гукавай літары, у сэнсавых эмацыянальных адценнях. Узяць хоць гэтую самую не простую літары, а агульную „хоцьбы", то галасна, то звонка, то ўзмацняюцца да forte (моцны), то паніжаюцца да піяно (слабы). На гэтай аснове ствараецца вакальна-графічны твор.


Хтось не дацісла адна мелодыя, а на другім ліс-це гучыць ужо іншая, непадобная. Нарастае і ўзмацняецца мінор, побач драматычны надпіс „Хатынь". Ніжні дапаможны, „абрубленыя" уяўныя літары, у цэнтры падкрэслена вылучаецца літара П – сціскаў тупіка, канца, і гучыць а-а-а! А далей напружаная і трагічная мелодыя – развітанне з Радзімай. „Вертуоз" – непарыўна і плаўна ў прасторы змяняецца тонкая лінія літараў, выкананая хуткімі тэмпамі, гучыць скрыпка. У гэтых графічных варыянтах – асацыятыўная вобразнасць, свет думак і пачуццяў. Напісанае слова ўспрымаецца не толькі графічным знакам, але і формай графікі.


Ілюстрацыі

Кветкалій двіц 111
Світанак 112, 113
Віртуозы 114
Вечны рух 115
Мажор, мінор 116
Этюд пэндлям 117
Старая кузня 118
Вобразная кампазіцыя „Літара" 119
Два варыянты графікі слова Мінск 120, 121
Дудкі (на літоўскай мове) 122
Графіка для жнівеі на музыцы 123
Дам мадэляў 124, 125
М. Агінскі. Паланез 126
Крыніца 127
Хатынь (2 варыянты) 128, 129
Шрыфтавая кампазіцыя (карта да фраптлагуінкі) 130
Лявоніха 131
Кампазіцыя 132, 133
Тэкст для каталогу 134
Стэнаграфічная каліграфія 135










Мінск





Bulmus


Дом
Мадэ —
Уладу


Модель






КРЫЛЬЦА





Отчётная выставка творческих групп




Ювілей
заатаўся—
напісаў Алтаеша.

Тэкст

(лац. textus – тканіна, злучэнне) – распаўсюджанае выкладанне ў пісьмовай ці друкаванай форме сказаў, слоў; лагічна стройнае і граматычна правільнае паведамленне.

Працуючы з тэкстам, неабходна добра ведаць і ўлічваць яго знаходжанне ў спакойным стане, каб асэнсаваць і эмацыянальна перажыць сэнс зместу, афармаваць творчую ідэю, каб пры напісанні парам вытрымаць стыль літаратуры, прасторавы рытм радка і тэксту ў цэлым. Характар кампазіцыі вызначаецца трыма абставінамі: а) жанрам (прозай, паэзіяй ці формай фразы); б) мастацкім стылем выкладання зместу; в) суб'ектыўнымі асаблівасцямі аўтара. З гэтага і „тэкстура" тэкставая фактура, уласцівасці якой ствараюць вобразныя ўласцівасці літаратурнага твора каліграфічнымі сродкамі.

Графічная інтэрпрэтацыя зместу тэксту не падпарадкавана строгім правілам.

У адным выпадку запазычваецца змест з паэтычных або празаічных твораў, фразаў, слоў. І быццам бы разам

з аўтарам, паралельна, вядзецца мастацкае развіццё ідэі. Вобразныя элементы пісьма ўзмацняюць змест тэксту. Графіка даступна для чытання і перажывання.

Сутнасць другога падыходу ў наступным. Загазыганы тэкст або змест выклікае суб'ектыўную вобразна-эмацыянальную зацікаўленасць і натхненне. У творым праўсе ёсць момант мастацкага перасэнсавання першапачатковага зместу. Гэтаму падпарадкаваны кампазіцыйны строй, характар пластыкі, моцна выяўлены эмацыянальныя акцэнты, росьпыркі. Чытаць тэкст цяжкавата, але можна.

Ці такая тэндэнцыя, калі выяўляецца суб'ектыўнае разуменне тэмы, дзе змест тэксту з'яўляецца толькі тэматычным матывам. Далейшае ў графіцы эмацыянальна-асацыятыўнае выражэнне тэксту. Такі каліграфічны твор будуецца на разуменні вобразна-знакавых знакамяняў лініі, яе віртуознасці росьпыскаў з вялікай амплітудай руху, прымяненні вострых кампазіцыйных прыёмаў. Гэта мастацтва дасканалых рухаў, розуму, эмоцый, рукі, калі вока „бачыць", а вуха „бачыць", у прамой лініі пераствораны гаворная, бясконая, у выгнутай — гэтая мелодыя, калі ліст паперы, больш поле дазнаёмваецца і перажываецца як сімвал прасторы і бясконцасці.

Так, у песні „Жёлман" – „носьбіт лёсу", шырокая рака. Кампазіцыя, рытм, падпарадкаванне вобразнай выразнасці руху вады і хваляў. Тут ніобы два графічныя вобразы: адзін – літаратурны, другі – асацыятыўны. А побач лінейна – пластычны рытм, гэта таксама „Жёлман", які толькі ўмоўна перадае абагуленыя вобразныя характарыстыкі. Глыбокі сэнс вершa Максіма Багдановіча „Страцім – лебедзь", жыццесцвярджальна гучыць бародная лінія і вядзе гэтую мелодыю.

Вось „Жніво" Янкі Купалы. Тут нямa традыцыйнага адлюстравання прыгожай дзяўчыны са сна-пам, а сама колеравобразная графіка пісьма стварае малюнак багатага ўраджаю. І жыта тут „царыцa".

У кожным творы ёсць штосьці сваё, што і вызначае яго мастацкую арыгінальнасць. Яна можа хваляваць, радаваць вока або схіляць да роздуму.

Ілюстрацыі


Эраза (2 варыянты) 140, 141
Крылаты выраз 142
Словы Канстанціна-філосафа 143
Мудрыя словы пацалункам
С. Полацкага 144
З кнігі М. Гусоўскага „Песня
пра зубра" 145
Тарасовы думы 146
Т. Г. Шаўчэнка. „Дняпро" 147
А. Міцкевіч. Каліграфічная па-
эзія 148
А. С. Пушкін. „Зімa" (фрагмент) 149
Каліграфічная паэзія на словы
Уёткі (А. Пашкевіч) 150–154
Сімфонія 155
М. Багдановіч. „Вераніка" 156
М. Багдановіч. „Страціш — ле-
дзьво" 157
Словы М. Багдановіча 158
Я. Колас. Вобразная графіка 159
Я. Купала. „Я бачыў" 160
Я. Купала. „Жніво" 161
Жэлман (песня) 162, 163
Аўтарскія словы 164
А. Блок, паэзія 165
Каліграфія 166
Песня „Беларусь" 167
М. Захарэнка (кампазіцыя) 168–169
Чатырохрадкове Я. Місуна 170
Лясная песня 171
Каліграфічны надпіс 172
Надпіс унутылалам 173
Анні дня без лініі (на лацінскай
мове) 174, 175


„Bajki
mają
moc"

Солнце светит для всех



Кирилл



Отроче юный
от детства
учися. Письмена
знати и разум
потщися. Не
вленися трудов
положити.
И мать бо
тебе полы
многа быти...

Свет даўгімі вывучаў я па кнігах славянскіх
Грамматах рускіх, кірылічай пісаных вязкай.
Лад алфавіта наш прамчаў для ўласцівай карысці
У гуках плазнічы і гукі мясцовых гаворак.
Здзіўшы з ім, іншаземцам, застаўся
садою.

1522







*


Татульку, я хачу чытаць;
Татульку, хачу свет пазнаць;
Татульку, ехаць хачу ўраз люры;
Татульку, набачыць хачу горы.


Толькі чытаць навучыце
Дый у свет сынка пусціце.





*



Татульку, я хачу гытаць;
Татульку, хачу свет пазнаць;
Татульку, ехаць хачу праз моры;
Татульку, пабачыць хачу горы.
Толькі гытаць навучыце
Дый у свет сынка пусціце.


Мамачка
Хаш нешта табе сказаць, але не паверыш так адразу пасля маіх
мітэў, дай Бог. Вушка: мамачка, ніде так не пекна як у нас.
Прынеры, калі сядзімо мы з табою на нашым
прыгорачку ў галіне, ля рэчкі, бягуць загоны, сівага аўса, па краю
ляжыць палоска, бела-ружовай грэчкі і ніжэй, вусцяў, ячмень
упіраецца пазамяцёшнымі загонамі ў канюшыну.
Або як дубьба наша
сінімі кветкамі ківаціца на сонцы.
Чырвоныя шаўкі бягуць
межамі. Ягункі, смалянкі, іскры чуюць, пчаліі; купальскае зелейка
кругам пахне, сінія званярушкі ў купінах куюе свае лекі;
сардэчкі чырвонымі ніткамі перакаквающь ручайкі, а васількі ў нашым
жыце.
Тут іншая краса, там іншая, а ў нас, мамачка, яшчэ іншая
— свая, мясцовая.


... Мамачка
Хаш нешта тайк сказаць, але не павернш так адразу пасля. маю
мстыў, дай Божа. Вушкі: мамачка, нідзе так не пекла як у нас.
Прыгожая, калі сядзімо мы з табою на нашым
прыгорачку ў галіне, ля рэчкі, бягуць загоны, сівага аўса, па краю
ляжыць палоска, быццам рыжовай тканкі і ніжэй, вусеці, яшчэ
упрасціцца пазалацістымі загонамі ў канюшыну.
Або як дуброва наша
сінімі кветкамі кіпіцца на сонцы.
Чырвоныя шаўкі бягуць
межамі. Ягункі, смалянкі, іскры гараць шапкамі; купалскае зелейка
кругам пахне, сіняя танізрушка ў купінах кіне свае лісці;
сарамлівыя чырвонымі ніткамі пераскокваюць рушнікі, а васількі ў нашым
жыце.
Тут, іншая краса, там іншая, а ў нас, мамачка, яшчэ іншая.
— свая, мясцовая.



Смык гатовы, струны ўнігі,
Кроў у жылах закіпае.
Ну, слухайце, мілы друг,
Скрыпка мая ўжо грае!


Мова хоча гора з мышц
Мова хоча гора з мышц
Мова хоча гора з мышц
Такі бої великої ваги
І таким було тільки ім'я



Прыраўняўшы, паглядзеўшы
Наша жыцце. Ўпаў. замлеўшы,
Прымкнуў вочы; бачу твары
Усе знакомы: пры АЛТАРЫ.
На хрэсцінах, на вяселлі,
То на ЖНІВЫ, то ў КАСЦЁЛ,
То пры ПРАЦЫ, то пры ЛЕЖЫ,
Тут і СЛЁЗЫ, тут і БАЛЕСЦІ,
Тут МАГІЛЫ, тут і ТРУНЫ,
Тут ГРАМНІЦЫ, тут цацкуны ...
Нейка пекла, нейка каша!

А дзе ж шчасце, братцы, наша?




М. Багдановіч


Спеў замлець —

і сама адгукнулася гула на ліры

Звонам ціхуткім струна...

Ці адзавецеся Вы?


Дзяцінства сны мае
І вобразы таленавітым сонцам!
І вось, і яе
„Акорд"
Адспеваны
Зачараны
Зяскоўным!
Якуб Колас т. 2. с. 89.




Я БАЧЫЎ, ЯК ВЕЦЕР ПА ПОЛІ ГУЛЯЎ,
ЗЯМЛЮ ЎЗРЫВАЎ І БЯРОЗКАЙ СЦЯЎ,
ЯК СЯЎ ПЯСКОМ СЕНАЖАТКІ, ЛАГІНКІ,
АДМАЎ НА ВЯРОЗЦЫ ЖЫВЫЯ ГАЛІНКІ.

Я БАЧЫЎ, ЯК ЯСТРАБ ГАЛУБКУ ЗАБІЎ,
І ВЫКЛЕВАЎ СЭРЦА, І ЦЁПЛАЕ КРОВІ ПІЎ;
ВІЎЧОР ЯЕ ПЕРА І КОСЦІ РАЗБЕЯЎ;
ГАЛУБЕ ВАСКАВАЎ, ГАЛАСІЎ БЕЗ НАДЗЕІ


Я БАЧЫЎ ДЗЯЦЬЛІНКІ НЯШЧАСНЫ ДЗІЦІ,
ЯК БЕГЛІ ДА РЭКІ, НЫРНУЛІ І ПАЎ!
ПАГНАЎ БЕЦЕР ЗАЎСЁДЫ І СЁЛЕТСІ ЗАГІДЗІЎ
НА БЕРАЗЕ БОЛЬШ ШЧМЕЛІ АБ ЗРАДЗЕ.


Я БАЧЫЎ ЎСЁ ГЭТА І ДУШОЮ ЦЯПЕЎ.
ЗАСТЫЎ СМЕЎ НА ГУБАХ І ПЕСНІ НЕ ПЁЎ,
ЗАПЛАКАЎ, ЗАЛІЎСЯ НАРОТНІ І СЯЗІНКАЙ
ЖДЗІЎ НАД БЯРОЗКАЙ, ГАЛУБКАЙ, ДЗЯЦЬЛІНКАЙ.






Ой, Гуцульщино, і пісня і слава
Народа нашого і землі,
Завдяки вірним синам цісній
Не раз твоє ховали були.
Рідна наша славна Гуцульщино,
Мисливська горянських рік,
Хто міг не тулятись у твій гамін,
Де хто пашаны не нёс.
Ой, Гуцульщино, ой бацька наш рідны,
Як сонця, як вогню вірні,
Давалі цьобунай Вадзіліна
Вас расцвілі вірні.



Як на досвітку гора заслоніць
Падкідушак ад ранак вады,
Трубым дауь ка мне дамоя дні
Кадрнаў шы дакі ад кудзеты.



Ижица
строчки
напряжения,
цветные.




Напышо паводкаю,
Загуло, як вецер,
Слова беларускае
На вялікім свеце.
Янка Купала


Белый аист летит над Полесьем, над тихим лесом...
Где-то в том болоте погребен остывающий прах.
Белый аист летит, всё летит над радужным полем.
Зеркалом нашей любви пенья блестящие крылья...


Коли мене тяжка іншим раз бере,
Слова не кладуться у рядок,
Тоді я фарбами думки викладаю –
Квітучий сержант, поле і ліс.


Коли мене цяжка інша раз бувас,
слова не кладуцца у радок
Тады я фарбай думкі выкладаю-
Вітчызну сяржанці, поле і лёс




VERBA
VOLANT,
SCRIPTA
MANENT


LIFE
LIFE
LIFE

Каліграфічны малюнак

— гэта канкрэтнае выяўленне вобраза на паперы або ўяўленні дакладным і няспынным арганізаваным рухам пяра ці іншага інструмента. Папярэднічае гэтаму глыбокі аналіз натуры, прадугледжае выкананне спецыяльных практыкаванняў. Давядзенне дакладнага руху рукі да аўтаматызму ў напісанні асобных элементаў або цэлых формаў.

Каліграфічнаму малюнку ўласціва стылізацыя формы ў выглядзе непарыўнай, плаўнай і зменлівай і „прыгожа" выкананай лініі, якая ўмоўна і асацыятыўна выражае графічны вобраз.

Аналізуючы графічныя сродкі малюнка, можна вылучыць тры тыпы ліній: а) выяўленчую, што максімальна дазваляе перадаць рэальны свет формаў павольным, перарывістым, фактурным рухам інструмента на плоскасці; б) каліграфічную, якая ўмоўна перадае адлюстраванне прадмета або прадмету, няспынна, віртуозна змяняюцы ў пра-

стопы і гукі, ствараюць лінейна-пластычны рытм; в) гукі-трывую, дакладную, інструментальную, выкананую пры дапамозе лінейкі, цыркуля, лякала, розных таўшчынь, якая схематычна перадае асобныя элементы, рухі выконваюцца не толькі хуткa, але і павольна.

Як музычнае вуха не дапускае фальшу, так і добра развітага вока каліграфа непрымальны лішнія дыяганалі лініі, зрываннe з рытму, парушэнне тэхнічнай эканомнасці і ясці лініі, часткая праўкі. За нахільнай лёгкасцю і прастатой графікі хаваюцца складаная і мазольная творчая праца. Але ўсё гэта застаецца там, за мяжою відавочнага.

„След на лёдзе" – гарманічныя рухі фігурысткі ў супровадзе музычнай мелодыі. Малюнак здаецца гатовым раз як графічаваны след ад слізгання.

„Ружы". Тут усё натуральна, нібыта лішнія, прыгожасць і дасканаласць.


„Нараўскі матыў" – гэта пазія. Развітальны круг быўла на адлёце ў вырай.

Ва унісон са сказаным гучаць вершы пра каліграфію.

Ілюстрацыі

Адажыо 179
Алегра 180
Лісток падае 181
Анюшкія кроплі 182
Пярэлка 183
След на лёдзе 184–185
Крыло вялікай птушкі 186
Зімовыя замалёўкі 187
Ружы 188, 189
Нараванскі матыў 190
Нябесныя гукі 191
Знак года 192
Дуэт 193
Меланхалія 194
Вітражі 195
Хірасіма 196
Белая птушка 197
Запраменны 198
Плакат для выстаўкі 199
Захад 200
Перарваны літаніс 201
Толькі пушча за плячыма шуміць 202
Пегас 203

ій справах залежить, якім буде дзень. Тыя, каго пераканаў
змест кнігі, зрабіце высновы, улашчы-
цеся вераю і працуйце, увекa-
вечваюць прыгожае
пісьмо.



Змест

Уводзіны 6

З гісторыі каліграфіі 12

Лінія 18

Літара 44


Шрыфт 72


Слова 108


Тэкст 136


Каліграфічны малюнак 176


Змест паасобнага 204

























Карпатські гамми

Замест пасляслоўя

У кожнага галавека свой, непаўторны і адзіны шлях у прафесію, дзе побач з аб'ектыўнымі заканамернасцямі і шлях вялікі невыканага. Асабліва гэта прыкметна, калі аўтар дае вынікі сваёй працы на суд грамадства. Калі аналізуецца не толькі яго творчасць, але і ўмовы, што абумоўліваюць яго матывы, што нельга растлумачыць, што ўяўляецца творчай таямніцай.

Да майстроў любой прафесіі я з дзяцінства адносіўся з вялікай павагай. Але больш за ўсё зайздрошчу тым, хто будуе храмы і робіць скрыпкі. Любая справа, па-майстэрску выкананая, выклікае цікавасць і захапленне. Магу любавацца стружкай, што вісуча з-пад разца, галюбіць дакладнасцю дэталі, зробленай на токарным станку, люблю пастукаць па кавадле малаткам, слухаючы яе мелодыйны звон, гладка па лініі абласаць дрэва, скрупулёзна паграваць іголкай. А ў узлым гэта вопыт і сродкі, якія даз-

валяюць свабодна выказваць творчы дух, пазбягаючы аднастайнасці. Але гэта мае асаблівы сэнс, калі вылучаецца штосьці адно, галоўнае.

Яляк паступова у мяне развілася цікавасць да гульні гожага пісьма, а затым і замацавалася вера у тое, што я на сапраўдным шляху. І за гэта цяпер удзячны лёсу. Імкненне да асэнсавання ўласцівасцяў першасных графічных формаў (кропкі, крыжы, лініі, рухі) дазволіла пазнаць таямніцу, калі пяро „Алегра" выконвае, калі рука „Грандэ" вядзе. І думаю, што мая сяброўнасць да „музыкальнай лініі" хутчэй за ўсё генетычная. Успамінаю, як у дзяцінстве я любіў легчы на зямлю, заплюшчыць вочы і адчуваць палёт у бездань дасканаласці. Адкуль гэта? Можа, гэта імкненне бачыць і перажываць не як усе. І ці не гэта фарміравала мае намеры у мастацтве? Так, пасля заканчэння мастацкага інстытута неабходна для сябе вырашыў заняцца тым, чым мала хто займаецца – шрыфтамі, каліграфіяй. Навучаю іншых гэтаму мастацтву і сам вучуся.

А што далей?

Вера у тое, што простае ілюструецца да складанага, а складанае – да простага, і ў гэтым няспыннасць развіцця і пазнання ўсяго існага. І што ты не адзінокі. І што ад тва-

Семянка П. А.
С 30 Мелодыі каліграфа: — Мн.: Полымя, 1993. — 207 с., ил.

ISBN 5-345-00478-1

У кнізе раскрыты творчы почырк, прафесійныя асаблівасці графіка-каліграфа, удзельніка замежных, усесаюзных, рэспубліканскіх мастацкіх выстаўак П. А. Семянкі. Прадстаўлена літарная графіка, каліграфічныя і шрыфтавыя кампазіцыі, узаемасувязь выяўленчага і тэкставога матэрыялу.

Адрасавана шырокаму колу чытачоў, будзе карысна школьнікам, студэнтам, усім, хто цікавіцца каліграфіяй і шрыфтамі.

С 1903040000-069 71-92
М 306 (03)-93

ББК 85-15



Научно-популярное издание
Семянко Павел Афанасьевич
Мелодии каллиграфа
Минск, издательство „Полымя"
На белорусском, русском, английском языках.

Навукова-папулярнае выданне
Семянка Павел Афанасьевіч
Мелодыі каліграфа.

Галоўная рэдакцыя Э. М. Бадрыцкая. Рэдактар Г. Г. Сімонык. Мастацкі рэдактар С. У. Стрэльскі. Тэхнічныя рэдактары Т. А. Тарасенка, М. А. Шабалінская. Карэктар Я. А. Лукошка.

Здадзена ў набор 05.06.91. Падпісана да друку 01.06.92. Фармат 60×90 1/8. Папера афсетная. Гарнітура „Тып Таймс". Афсетны друк. Ум.-друк. арк. 26,0+вкл. 2,0. Ул.-фарб.-адб. 55,0. Ух.-выд. арк. 26,01. Тыраж 5000 экз. Выд. № 3572. Зак. 125.

Выдавецтва „Полымя" Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Карэнскага, 20.

Її справу залежить, якім буде день. Тая, кого переканаю
Зміст книгі, зробить висновку, умаюю –
усяя вераю і праціцьце, увека –
вевваюсь прыгожае
пісьмо.

